# ВЫХАВАННЕ МОЎНАЙ КУЛЬТУРЫ СТУДЭНТАЎ ТЭХНІЧНАЙ ВНУ ПРАЗ ТВОРЧУЮ ДЗЕЙНАСЦЬ У РАМКАХ ПАЗААЎДЫТОРНАЙ РАБОТЫ

**Дапіра Т.П.**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*Беларусь, Мінск*

Анатацыя
У артыкуле раскрываюцца паняцці выхаваўчай працы ў пазавучэбны час, актывізацыі слоўніка навучэнца, культуры, аргументацыі ў маўленні, творчай дзейнасці. Разглядаюцца асаблівасці фарміравання моўнай культуры студэнтаў праз творчасць на прыкладзе правядзення агульнаўніверсітэцкага конкурсу.

***Ключавыя словы:*** *выхаваўчая праца ў пазавучэбны час, актывізацыя слоўніка навучэнца, аргументацыя, творчая дзейнасць.*

Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі вызначае навучанне як мэтанакіраваны працэс арганізацыі і стымулявання вучэбнай дзейнасці навучэнцаў па авалоданні імі ведамі, уменнямі, навыкамі, фарміраванні ў іх кампетэнцый і развіццю іх творчых здольнасцей.

Выхаваўчая праца ў пазавучэбны час – мэтанакіраваная, сістэматычная і запланаваная дзейнасць прафесарска-выкладчыцкага складу, накіраваная на фарміраванне ў навучэнцаў пачуцця патрыятызму, грамадзянскасці, павагі да чалавека працы і старэйшага пакалення, беражлівых адносін да гісторыка-культурнай спадчыны і традыцый беларускага народа, стварэнне ўмоў для самавызначэння, сацыялізацыі і самарэалізацыі асобы навучэнца на аснове сацыякультурных, духоўна-маральных каштоўнасцей і прынятых у грамадстве правіл, норм паводзін у інтарэсах чалавека, сям'і, грамадства і дзяржавы [1].

Сучасны адукацыйны працэс павінен у значнай ступені садзейнічаць павышэнню эфектыўнасці міжэтнічнай камунікацыі, паглыбленню культурнага ўзаемаразумення, пранікненню ў разуменне духоўных каштоўнасцей, маральных прынцыпаў жыцця і дзейнасці, развіццю моўнай і культурнай кампетэнцый асобы навучэнца.

Актывізацыя слоўніка навучэнца – узаемазалежная дзейнасць выкладчыка і студэнта, накіраваная на пашырэнне яго актыўнага слоўніка, што складаецца ва ўключэнні новых, яшчэ не актывізаваных слоў у моўную практыку з заданнем выкарыстоўваць іх пры самастойным складанні тэкстаў

разнастайнага кшталту. Канкрэтныя прыёмы актывізацыі слоўніка студэнта: складанне словазлучэння і сказа з зададзеным словам; абавязковае ўжыванне пэўных слоў у вусным пераказе і пісьмовым выкладзе і г.д. [2, с.10].

Адукацыйныя стандарты Рэспублікі Беларусь прад’яўляюць ўстанове вышэйшай адукацыі патрабаванне праводзіць паслядоўную працу па фармаванні ў студэнтаў каштоўнасных арыентацый, нормаў і правіл паводзін на аснове дзяржаўнай ідэалогіі, ідэй гуманізму, дабра і справядлівасці. Выпускнік павінен валодаць грамадзянскай сталасцю, прававой і палітычнай культурай, паважаць закон і беражліва адносіцца да сацыяльных каштоўнасцей прававой дзяржавы, гонару і годнасці грамадзяніна.

У шырокім сэнсе культуру вызначаюць як усё тое, што створана і ствараецца ў выніку чалавечай дзейнасці. Гэта не толькі матэрыяльныя, фізічныя аб'екты (прылады, прадметы побыту, прадметы мастацтва), але і нешта нематэрыяльнае – каштоўнасці, звычкі, звычаі, традыцыі, нормы паводзін і г. д. Культура – гэта сістэма поглядаў, каштоўнасцей, нормаў вераванняў, звычаяў, традыцый і ведаў, уласцівых пэўнаму грамадству. Прычым гэтае грамадства не абавязкова з'яўляецца этнасам, гэта можа быць і буйнейшая група людзей, і тады гаворка ідзе пра міжэтнічныя каштоўнасці і нормы; у пэўнай меры да іх адносяцца, напрыклад, розныя рэлігійныя культуры, носьбітамі якіх з'яўляюцца прадстаўнікі некалькіх этнасаў. Носьбітамі культуры могуць быць больш «дробныя» ў параўнанні з этнасам сацыяльныя групы – грамадскія класы, асобныя пакаленні людзей нейкага грамадства. Гэта значыць, вы і вашыя бацькі ў некаторым сэнсе з'яўляецеся носьбітамі розных культур [3, с.7].

Дысцыпліна «Беларуская мова (прафесійная лексіка)», як і іншыя прадметы гуманітарнага цыкла, спрыяе станаўленню моўнай асобы, умацаванню міжпрадметных сувязей, праяўленню своеасаблівага ўяўлення пры развіцці мовы, павышае ўзровень усведамлення сацыяльнай ролі мовы чалавека, выпрацоўвае ўменне аргументацыі выказванняў.

Аргументацыя – доказ, абгрунтаванне выказанай думкі. Добрая аргументацыя – адна з асноўных якасцей развітай гаворкі. Адсутнасць аргументацыі можа расцэньвацца як лагічны недахоп сачынення, вуснага паведамлення, даклада. Аргумент – структурны элемент (-ы) любой развагі: тэзіс развіваецца і даказваецца ў сачыненні-разважанні з дапамогай менавіта аргументаў. Прычым яны могуць быць самымі разнастайнымі: прывядзенне прыкладаў з сучаснага жыцця або з гісторыі, з мастацкай літаратуры і іншых мастацтваў, спасылкі на меркаванні аўтарытэтных людзей, лагічныя доказы, выкладанне ўласных мэт, задач, уласнага разумення шляхоў вырашэння пастаўленых мэт і задач, абвяржэнне чужых меркаванняў, з якімі аўтар не згодны, і да т. п. [2, с.14].

Даволі важным у развіцці маўлення выступае і ўяўленне. Гэта працэс разумовага стварэння новых вобразаў па аснове элементаў мінулага досведу. Уяўленне ляжыць у аснове большасці відаў творчых работ навучэнцаў.

Творчая дзейнасць студэнтаў БДУІР як на занятках па беларускай мове, так і ў рамках пазааўдыторнага часу – сукупнасць разнастайных відаў работ, у

якіх праяўляецца самастойнасць мыслення, дзе навучэнцы ствараюць новыя арыгінальныя тэксты, актыўна складаюць вусныя і пісьмовыя нарысы, артыкулы, паведамленні і інш. па выніках уласных назіранняў, даследаванняў. У творчых работах адлюстроўваюцца пачуцці, погляды, жыццёвая пазіцыя асобы. Творчыя работы выступаюць вельмі моцным выхаваўчым сродкам. Да іх ліку адносяцца сачыненні, эсэ, стварэнне відэаролікаў, розныя імправізацыі, нават выразнае чытанне ўслых. Безумоўна, вышэйшай формай творчасці студэнтаў з’яўляюцца іх першыя літаратурныя спробы: проза, вершы, артыкулы ў газетах і часопісах, напрыклад у газеце «Імпульс», якая выпускаецца ў БДУІР. Дзякуючы магчымасцям праявіць сябе, выказаць уласныя думкі, заняць пэўную пазіцыю пры разглядзе той ці іншай праблемы, якія прапануюцца студэнтам на занятках, фарміруюцца сур’ёзнае, удумлівае і разам з тым прыязнае стаўленне да няпрофільнага, аднак вельмі важнага для сацыякультурнай адукацыі прадмета. У межах дысцыпліны павышаецца агульная культура асобы, выхоўваецца моўны густ, дапытлівасць, працавітасць, самастойнасць. Усё гэта дазваляе выкладчыку і самому расці ў сучасных прафесійных кампетэнцыях [4].

«Многія лічаць, што сёння чалавецтва з’яўляецца «палоннікам» інфармацыйных тэхналогій. Камп’ютары, смартфоны і іншыя прылады прысутнічаюць амаль у кожнай сферы жыцця чалавека. Але тэхніка, на маю думку, ніколі не заменіць слова, бо яно, як і чалавек, – жывая істота. Слова ёсць частка самой асобы, менавіта праз слова адбываюцца зносіны, ствараецца грамадства. «Спачатку было Слова» – і будзе жыць яно заўсёды, пакуль жыве чалавек!» – так выказаўся наконт важнасці мовы і слова ў прыватнасці у сваім эсэ студэнт інжынерна-эканамічнага факультэта Аляксей Клімовіч.

«Сучасны чалавек шмат часу праводзіць у сацыяльных сетках. Чаго там толькі няма! Але як часта ў каментарыях да якой-небудзь навіны на чалавека, асобу, выліваецца столькі негатыву, жорсткасці, што, здаецца, з гэтым проста немагчыма жыць. Мы крытыкуем усё: палітыку, моладзь, спартсменаў, знакамітых асоб, суседзяў, сяброў. Разважаем на тэмы, аб якіх маем вельмі невыразнае ўяўленне. Адкуль у нас столькі непавагі да іншых людзей? Як часта мы сутыкаемся з тым, што нас займаюць глабальныя пытанні, якія вырашаюцца без нашага ўдзелу, а тыя, хто побач з іх праблемамі, меркаваннямі, хваляваннямі, застаюцца без нашага спачування, добрага слова, падтрымкі. Нам прасцей зрабіць выгляд аб заклапочанасці лёсам сусвету, чым звярнуць увагу на тых, хто побач, адкрыць сваю душу блізкім, пагутарыць, паразважаць, выслухаць і пасадзейнічаць ў сітуацыі «тут і цяпер». Так разважае ў сваім эсэ студэнтка факультэта камп’ютарных сістэм і сетак Наталля Рагожкіна.

З 2018 г. кафедра агульнаадукацыйных дысцыплін ФДПіПА, з’яўляецца арганізатарам агульнаўніверсітэцкага творчага конкурсу, які праводзіцца штогод для студэнтаў І курса ўсіх факультэтаў БДУІР. Мэты конкурсу – развіццё творчых здольнасцей моладзі, выяўленне адораных студэнтаў, полікультурнае, эстэтычнае выхаванне, пашырэнне кругагляду па пытаннях маральнасці ў сучасным свеце.

Конкурсная работа можа прадстаўляць сабой празаічнае эсэ, апавяданне ці паэтычны твор на адну з прапанаваных арганізатарамі тэм. Напрыклад:

«Мы з вамі дзеці адной гісторыі» (У. Караткевіч);

«Слова! Яно неабсяжнае, як сусвет» (У. Юрэвіч);

«Чым вякам ты пахвалішся, у вяках чым праславішся, час маторны і мутарны, электронны, камп'ютарны» (А. Грачанікаў);

«Нашто, скажы мне, ты жывеш і з думкамі якімі?» (А. Гарун);

«Мы марым пра касмічнае міжзор'е, а блізкіх нам не можам зразумець…» (Г. Бураўкін);

Што азначае быць інтэлігентам?;

«Дарог у свеце вельмі многа, а ты між іх сваю знайдзі…» (П. Броўка);

«Не дай мне Бог духоўным стаць бадзягам, без памяці жывой, без каранёў…» (В. Зуёнак) і інш.

Трэба адзначыць, што кожны раз больш за 300 студэнтаў спрабуе сябе ў творчым выяўленні сваіх думак, прычым работы ўдзельнікаў самыя разнастайныя па жанрах і стылістыцы. Праз творчую дзейнасць у рамках пазааўдыторнай работы з'яўляецца ўнікальная магчымасцю як для выкладчыка-прадметніка, так і для студэнта павысіць эфектыўнасць і якасць узаемадзеяння адукацыйнага і выхаваўчага працэсаў.

Выхаваўчы патэнцыял навучання на роднай мове, павышэнне чалавечай культуры праз творчую дзейнасць – галоўныя дыдактычныя прынцыпы. Значныя магчымасці дадзенай работы ў арганізацыі атмасферы пазнавальнага пошуку, высокага ўзроўню зацікаўленасці, у вызначанай патрабавальнасці, творчай ўзаемадапамозе. Творчая пазааўдыторная работа спрыяе атмасферы сумленнасці і праўдзівасці, прывіццю павагі і любові да нацыянальнай мовы і культуры, разуменню яе міжнароднай ролі, стварэнню якаснага маўленчага асяроддзя.

Літаратура:

1. Кодекс Республики Беларусь об образовании. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.pravo.by/document/?guid=3871&p0=hk1100243 – Дата доступу: 12.10.2023.
2. Львов, М. Р. Словарь – справочник по методике русского языка: Учеб. пособие для студентов пед. ин-тов по спец. «Рус. яз. и лит.» / М.Р. Львов.– М.: Просвещение, 1988. – 240 с.
3. Гузикова, М. О. Основы теории межкультурной коммуникации : [учеб. пособие] / М. О. Гузикова, П. Ю. Фофанова ; М-во образования и науки Рос. Федерации, Урал. федер. ун-т. – Екатеринбург : Изд‑во Урал.ун-та, 2015. – 124 с.
4. Дапіра, Т.П. Фарміраванне светапогляду навучэнцаў праз творчую дзейнасць у рамках дысцыпліны «Беларуская мова (Культура маўлення)» / Т. П. Дапіра, І. В. Наўроцкая // 57-я научная конференция аспирантов, магистрантов и студентов учреждения образования «Белорусский государственный университет информатики и радиоэлектроники», 19-23 мая 2021 г., БГУИР, Минск, Беларусь: тезисы докладов. – Мн. – 2021. – С.8 – 9.

# EDUCATION OF THE LANGUAGE CULTURE OF TECHNICAL UNIVERSITY STUDENTS THROUGH CREATIVE ACTIVITY IN THE FRAMEWORK OF EXTRACURRICULAR WORK

**Dapiro T.P.**
*Belarusian State University of Informatics and Radioelectronics*
*Belarus, Minsk*

Abstract
The article reveals the concepts of educational work in extracurricular time, activation of the student's vocabulary, culture, argumentation in speech, creative activity. The features of the formation of the language culture of students through creativity are considered on the example of a university-wide competition

***Keywords**: educational work in extracurricular time, activation of the student's vocabulary, argumentation, creative activity*